Панас Прусак

Міколавы апавяданні

# КАНФЕРЭНЦЫЯ

kamunikat.org

СПРАВА

**Панас**
**ПРУСАК**

*

*Міколавы апавяданні*

*

# КАНФЕРЭНЦЫЯ

СПРАВА

**Брылі**
**2004**

KAMUNIKAT.org

## У с т у п .

Сёння час, браткі, цікавы:
Рэферэндум[1] адгрымеў,
У Палаце зноўку справы[2],
Толькі лёс, як і рыпеў,
Так й рыпіць іржавым колам
У сівую далячынь…

## З н а ё м с т в а .

Зноў прыбег Яцкоў Мікола[3] -
Закрычаў: "Панас, прыкінь:
Каб не выбары ў Палату
І не гэты ўвесь сыр-бор,
Не зайшоў бы ён у хату!
Хто? Завуць яго Рыгор[4],
Ён з падворка Кастусёва,
Што ў бялыніцкай зямлі,
І прыехаў аж са Шклова
Ў нашы сціплыя Брылі[5].

А ты памятаеш, братка,
Як брылеўская ўся хатка
Загула, зашамацела,
Калі хтось вусаты смела
Абдымаў жанчын ля крамы
І лятаў туды – сюды?
Гэта быў Рыгор, той самы, -
Спрытны, моцны, малады.

З ім былі Таборка Вова[6]
Сам Віталька Васількоў[7],

**Нейкі хлопец з Магілёва –**
**І яны без лішніх слоў**
**Падзяліліся сакрэтам:**
**Абляпілі ўсё партрэтам,**
**На якім царква, Рыгор**
**І - дарога аж да зор…**

**І знаёмства жа, вядома,**
**Адбылося ў той прыезд.**
**Потым – выбарчыя стромы,**
**Спадзяванняў цёмны лес,**
**Паражэнне…**
**І імкненне**
**Ўсё ж Брылі не забываць –**
**Бо з'ядналася карэнне**
**І сімпатый не адняць.**

**Вось такая, брат, пятрушка!**
**Тут палітыка – ого!..”**

## З а п р а ш э н н е .

**Змоўк Мікола.**
**Вецер гушкаў**
**За Рудэяй[8] між стагоў.**
**Вечарэла.**
**І паэце**
**Свой падоўжыў успамін:**

**“Усё-ткі ён мяне прыкмеціў!**
**Бо аднойчы раптам, блін,**
**Тэлефон устрапянуўся.**
**І у трубцы зноў пачуўся**

**Голас шчырага Рыгора:**
*“У мяне,* **- гаворыць, -** *гора:*
*З магілёўскае прасторы*
*Трэба ўсіх хлапцоў сабраць*
*Й талакой абмеркаваць*
*Траекторыю “пралёту”*[9].
*Ну, а ты, мой сябра, потым*
*Будзеш песні нам спяваць*[10].
*А ці згодны? Ой, цудоўна!*
*Я ўжо думаў – скажаш “не”.*
*Усё мы зробім там грунтоўна,*
*Будзе сонейка ў акне!*
*Збор у “Коле”*[11]*, у нядзелю!*
*Усё! Чакаю!”…*
**Бачыш, як!..**
**Ну, вядома ж, паляцелі,**
**Бо ў Брылях тых ні х… халеры**
**Не бывае – хоць ты плач!**
**Калі й мае што памеры,**
**Дык брылеўскі вечны срач.**

## Ч к а л а в а, 16 .

**Чатырнаццатага**[12] **ранкам**
**Я і Алачка-каханка**[13]**,**
**Дзетак кінуўшы, сабаку,**
**Кіламетраў восем з гакам**
**Сухарэўскім аўтабанам**[14]
**Пёрлі так, што пыл слупом.**
**Падрулілі трошкі рана,**
**Вось і “Чкалава”, той дом**[15]

**“Дзынь!”, калітка падалася,**

**Два ахоўніка глядзяць,-**
**Во ў якім жывём мы часе!**
**Думаў, будуць нас "шманаць"**
**На прадмет, напрыклад, бомбы.**
**Не, звычайны фэйс-кантроль.**

**Ой, вы, "Колавы" вантробы,**
**Палітычная юдоль!..**

**А народу – да халеры.**
**Рэгістрацыя: *"Вы хто?"* –**
**"Мы – брылеўскія жаўнеры!" –**
***"Глянь – вяскоўцы ў нас!"* –**
**"А то!" –**
***"Да якога ж вас хаўрусу***
***Прыпісаць?.. Чакайце! Шэф!***
***Вось куды іх?"* – *"Беларусы?"* –**
**"Так!" – *"Пішыце ў БНФ!"*[16]**

**О, партыйцамі мы сталі!..**
**Нейкіх нам газэт напхалі**
**І напрамак паказалі –**
**Вось мы ў залі.**
**Тут – Рыгор,**
**Як той дзядзька Чарнамор –**
**На чале ўсяго працэсу.**
**Нас убачыў, прасвятлеў:**
***"Ну, нарэшце з свайго лесу***
***Вы ўлятаеце ў наш спеў!***
***Малайцы! Бліжэй сядайце –***
***Каб убачыць і пачуць.***
***Усё, пабег я, выбачайце, -***
***Трэба трошкі тут зірнуць!"***

**А спадарства прыбывае,**
**Важных постацей зашмат;**
**Адчуваецца – кроў грае:**
**Кожны тут, як той Сакрат[17],**
**Што калісьці не схіліўся**
**І ў гісторыю ўляпіўся,**
**Узбударажыўшы вякі.**

**Параўнанне тут з рукі,**
**Бо у зале невялічкай**
**Адчуванне надышло**
**Гістарычнага падліку,**
**І ўжо нешта загуло...**

## П а ч а т а к.

**І над гэтам голас звонкі –**
**Кастусёў пачаў хаду:**
***"Трэба нам пакінуць звонку***
***Нашых сварак чараду!***
***Мы ж уладам паказалі,***
***Што ёсць праўда,***
***гонар,***
***моц!***
***Сваю ніву мы ўзаралі!***
***І хай знае шклоўскі поц,***
***Што мы ёсць,***
***былі***
***і будзем,***
***Што свабодныя мы людзі,***
***І ўсё болей нас штодня!***
***Ну, а лічбы – то хлусня:***
***Ўлады ўсё падтасавалі –***

*Не такі там быў працэнт!*
*Рэпутацыю ушчэнт*
*Усёй краіне абламалі –*
*Апусцілі аж дасюль!*
*Але ўжо паўсталі хвалі*
*І іх бачна адусюль!”*

**Зачапіў сваёй прамовай**
**Наш Рыгорка грамаду –**
**Загудзелі ўкруг галовы:**
**“Бу-бу-бу” ды “ду-ду-ду”**

**І скрозь гэта балбатанне**
**Лёха Колчын[18] танкам прэ:**
*“Мы рабілі назіранне!*
*І ніхто не адбярэ*
*У “вясноўцаў”[19] лічбы тыя –*
*Не прастыя – залатыя! –*
*Па акрузе 73![20]*
*Пра заявы і адмовы,*
*Пра зняважлівыя словы*
*І пра ціск той стопудовы, -*
*Ай, халера іх бяры!*
*Добра, што далі ўсім веры*
*Нашы госці-гандальеры –*
*Аж з Венецыі самой!*
*Там камісія такая[21],*
*Што, ну проста – Божа ж мой!”*

**Бач, Італія якая –**
**Як стаіць за нас гарой!..**

**За трыбуну тут узяўся**
**Пан Макананка Віталь[22]:**

*“Хлопцы! Я тут разабраўся*
*Як нам трэба тую сталь*
*Гартаваць і гартавацца!*
*Мы за гвалт не будзем брацца –*
*Мы паціху, спакваля*
*Уладкуемся ў засадзе,*
*Скажам гэтай гадскай ўладзе:*
*“Хопіць вашага ля-ля!”,*
*І з таго, што сёння маем,*
*Геніяльна адшукаем*
*Мы персону, бо – пара!*
*Без персоны ўсё – мура!*
*Заадно на тых артыстаў,*
*Што працуюць на рэжым,*
*Плюнем мы разочкаў трыста!*
*Скажам мы: “Ганьба!” ўсім ім!*
*У Літву няхай з’язджае*
*Кожны здатны наш спартсмен!*
*Мы нікога не пужаем!*
*Крочым мы да перамен!”*

**П е р а п ы н а к .**

**І на той спартыўнай ноце**
**Перапынак у рабоце**
**Аб’явілі.**
**І бягом**
**Грамада затупацела**
**Да сталоў, накрытых смела, -**
**Пачала смятаць нагбом**
**Бутэрброды, піва, сала.**
**Праз імгненне ўсё прапала –**
**Толькі й здолела мне Ала**

**Хлеба выхапіць кавалак**
**З грамам сціплай каўбасы.**
**Мы ж, браток, - беларусы:**
**Як не схопіш, дык не будзе –**
**Пераб'юць халтуру людзі,**
**Больш спрытнейшыя за нас.**

**Ну, дык вось. Мяне як раз**
**Тут Рыгор схапіў за яйцы,**
**Кажа: *"Будзеш выступаць!***
***Трэба з вашага акрайца***
***Нешта трапнае сказаць.***
***Падрыхтуйся і – наперад!"*** **–**
**Сам пабег кудысь за дзверы.**

**Што казаць?.. О, ёсць ідэя:**
**Камісарскі "чорны спіс"[23]!**
**Трэба гэту дыярэю,**
**Нечаканы той сюрпрыз**
**Перагледзець прынцыпова,**
**Бо было камусь х..ёва –**
**Ён тут дроў і наламаў.**

## В а с і л ь .

**А тым часам, ззаду ўзяў**
**Хтось мяне за локаць цвёрда, -**
**Я, браточак, ледзь не пёрднуў**
**З нечаканасці такой!**
**Азірнуўся: Божа мой,-**
**Сам Аўраменка! Свяціла!**
**Ніў медычных васілёк!**
**Песні піша – там жа сіла[24]!..**

**І адразу:** ***“Дзе насіла!***
***З-пад якіх глядзеў аблок***
***Ты на гэта ўсё, Мікола?”***

**І спачатку неяк квола,**
**А затым чароўным стансам**
**Упляліся словы ў час…**
**Нават Суднік[25] прэферансам**
**Спакусіць не здолеў нас.**

**І канапа Васількова**
**Паўтарала нашы словы,**
**І пакой нас казытаў…**

## Д ы с к у с і я .

**А між тым, ізноў паўстаў**
**Подых велічнага сходу;**
**Значна больш ужо народу –**
**Над усімі зноў Рыгор:**
***“Так, прадоўжым наш сыр-бор!***
***Хто наступны? Зараз гляну, -***
***Слова, хлопцы, Падаляну[26]!”***

**Паглядзеў на усіх трывожна**
**Камуніст – сустаршыня:**
***“Так далей нам жыць няможна!***
***Гэта ж нейкая х..йня:***
***Не паспеў стаць кандыдатам,***
***Як мяне з ліцэя – вон![27]***
***Усе мы трапілі за краты!***
***Хай гучыць набатны звон!***
***Трэба йсці нам да народа –***

**Ён чакае нас даўно!**
***А не то замест свабоды***
***Атрымаем зноў гаўно!"***

**Тут шклаўскія загудзелі,**
**Падхапіўся пан Шчарбак[28]:**
***"Дзе ж "пяцёркаўцы"[29] сядзелі?***
***Ну, чаму такі бардак?!***
***Ці ўстрывожылі бабулю***
***І "Пяцёрка", і той "Плюс"?***
***Ды куды! Ізноўку дулю***
***Атрымалі мы пад вус!***
***Кожны шчэміцца да ўлады –***
***Пальцам ткні, дык прайдзісвет!***
***Грошы нам аддайце, гады,***
***І не засціце нам свет!"***

**Тут здалося: зараз Саша**
**Пакалоціць менчукоў.**
**Ну, шклаўскія – радасць наша:**
**А ні-ні без кулакоў!**

**Жвава ўцiснуўся Рыгорка:**
***"Зараз выступіць Яцкоў!"***
**Я пачаў: "*Спадарства! Горка!***
***Мы ж аб тэйбл фэйсам зноў***
***На..бнуліся ў "Праграме"!***
***Пункт чацвёрты: "чорны спіс".***
***Што – ў тым выбарчым бедламе***
***Не было праўдзівых рыс?!***
***Я ў Брылях быў старшынёю[30] -***
***Нервы рваў я той х..йнёю***
***І сумленне не згубіў!***
***Атрымалася – набыў***

*На Эўропу забарону*
*І шлагбаум на шляху.*
*Гэта што ж за забабоны?*
*У каго знясло страху?!”*

**У адказ – аднекуль з краю:**
*“Мы ж цябе, Мікола, знаем:*
*З намі ты заўжды заўзята!*
*Куды хочаш – туды едзь!*
*Ну, а тых фальсіфікатаў*
*Ва ўсе дзіркі будзем мець –*
*Хай не лезуць, дзе не трэба!*
*Зробім ім з аўчынку неба!”*

**Супакоілі старога –**
**Ўжо не ведаў, што й рабіць.**
**Толькі холадам аблога**
**Ледзь паспела зачапіць…**

**Загрымеў Беразіенка[31] -**
**Камуніст,**
**прафесар,**
**штык:**
*“А нашто нам Лукашэнка?*
*Губернатару кірдык*
*Мы зрабіць павінны дружна!*
*Да Батуры[32]! Глянем мужна*
*Ў тыя хітрыкі вачэй!*
*Ды за сраку свалачэй!*
*Ды пастукацца ў вароты*
*Упраўлення КДБ[33] -*
*Хай распішуць нам па нотах*
*Праўду ўсю – ад “а” да “бэ”!”*

**О, ты глянь: без КДБ мы**
**Ну, ніку́ды, тваю маць!**
**Калі шчэ няма праблемы –**
**Можам хутка атрымаць!**

**Тут бабруйцы піханулі**
**Свайго Хоцьку[34] да відна:**
***“Хлопцы! А ці вы не чулі?***
***Ідзе халодная вайна!***
***Мы запомнім гурт варожы,***
***Й – можа, гэта непрыгожа –***
***Потым іх усіх абложым –***
***Не, не матам – пракурорам!***
***Будзе свята і у нас!”***

**Ой, з бабруйскімі зноў гора!..**

**А, між тым, у нас атас –**
**Шклоўскі хлопец на трыбуне:**
***“Я - Алейнікаў[35]! Так, - з тых!***
***З гарадзецкай нашай пуні***
***Чуем мы апошні ўздых***
***Змардаванай, кволай вёскі!***
***Пазнасіліся ў абноскі!***
***Трэба рухацца да ўладаў,***
***Каб яны рабілі, гады,***
***У вытворчасці уздым!***
***Ну, а ўлеткі пра мільярды[36] -***
***Абы што, туфта і дым!”***

**Чуеш? – Зноўку, ну, няможна**
**Без уладаў! Нейкі клін!..**

**А тым часам, асцярожна**

**Лезе самы мужны сын**
**Бессмяротнага народа –**
**Бора Бухель[37]: “*Да свабоды***
***Трэба крочыць праз падлік!***
***Назіральнікаў паставім,***
***І адсочым, і паправім,***
***А хто супраць – ім чык-чык***
***З дапамогаю актыву,***
***Што збярэцца ля дзвярэй!***
***Вось такая перспектыва!***
***Не падумае яўрэй –***
***Дык ніхто ж не варухнецца!***
***Ой-вэй, сэрца маё, сэрца!..***
***Толькі трэба трошкі грошай –***
***Тысяч дзвесьце тых “грыноў”[38]*, -**
***Будзе ўсё тады прыгожа –***
***Ад асноў і да высноў!”***

**О, карысці ўсё ж нямала**
**Ад сяброўскага кагала!..**

**І бабруйцы не ўцярпелі:**
**Загудзелі, закрахцелі –**
**Во, генетыка дае! –**
**І Алесь Чыгір[39] устае:**
***“Што вы ў офісах паселі?!***
***Да людзей ідзіце, пні!***
***Вунь я ў вёсках трошкі сеяў –***
***Дык адразу карані***
***Набрынялі, патаўсцелі***
***І такімі сталі вось!***
***Толькі там мы счуем штось!”***

**А ўсё кажуць: вёска, вёска…**

**Мы – патрэбныя заўжды!**
**Мы не кропка, браце, - коска,**
**Лёсу спеўныя лады!..**

**За бабруйцам – магілёўцы:**
**Вунь Сярожа наш, Фамін[40],**
**З барады залускаў слоўцы:**
***“Хто адкажа мне? Іхь бін,***
***Ну, зусім не разумею –***
***Што дзяліць нам? Ну, чаму***
***Часам гушкаюць завеі?***
***Зараз голас уздыму:***
***Раз’яднання нам не трэба!***
***Мы жа моцныя! Нас – раць!***
***І над намі – наша неба!***
***Нашых коней -- не стрымаць!”***

**Васількоў тут падхапіўся:**
***“Я, шаноўныя, здзівіўся –***
***Як мы добра спрацавалі,***
***Як мы ўлады напужалі!***
***Сёння ж трэба ў шыю гнаць***
***Ад сябе расчараванне!***
***Патрабуецца абраць***
***Нам Персону! І абранне***
***Хай наш градус палітычны***
***Узнясе аж да нябёс!***
***Хлопцы! Будучыня кліча!***
***Спраў наперадзе ў нас – воз!”***

**Васількоў, вядома ж, - сіла!**
**Мы за ім, як за сцяной, -**
**Вунь як словам уздыбіў крылы!**
**Ой, ну выліты герой!..**

**Мілінкевіч[41] (што з Гародні)**
**Са сваіх вышынь заходніх**
**Нам паблажліва сцадзіў:**
***“Я тут троху пахадзіў,***
***Усё агледзеў, і адзначу –***
***Ой, гаротны ваш усход:***
***Горад стогне, вёска плача,***
***І -- затурканы народ.***
***Мы ж на захадзе – працуем:***
***Вёску планамі мацуем,***
***Стос праграм распрацавалі***
***Для мястэчак. Не сядзім!***
***І ў квітнеючыя далі***
***Мы упэўнена глядзім!”***

**Ой, занудлівую п’есу**
**Тую чулі сто разоў!**
**Мы для іх – заўсёды Крэсы[42],**
**Тормаз іхняга прагрэсу,**
**Тля крывіцкіх каранёў.**

**Да размовы падключыўся**
**Арцішэўскі[43] з “Грамады”[44]:**
***“Шмат чаму я навучыўся,***
***Бачу: крок нам да бяды!***
***І Беслан[45], і рэферэндум –***
***Ланцуга адно звяно!***
***Усякім бабкам зробім пендаль!***
***І патрэбна нам адно –***
***Каб дзяржавай кіравала***
***Толькі партыя мая!”***

**Збоку шэпты: *“Ўсё ім мала!***

*Не дадзім ім ні..уя!”*

**Тут у гальштуку й кашулі**
**Янукевіч[46] з БНФ:**
***“Я хачу, каб вы пачулі:***
***Перамога ўлады – блеф!***
***Мы саставім спісы ўсё-ткі –***
***То, спадар Яцкоў не вам! –***
***Будуць ім яшчэ адсоткі!***
***Ох, прыпомнім той бедлам!..***
***FM-станцыі падключым!***
***Будзем Юшчанку[47] прасіць***
***З Украіны ўсё агучыць, -***
***Не ўсё ж сала стуль вазіць!”***

**Тут ужо піхае Лёшу**
**Севярынец Паша[48]: *“Мы***
***Ўсё зрабілі бы прыгожа,***
***І грымелі бы грамы,***
***Каб былі адзіным звязам!***
***Крыкнем разам: “Гэй! Да нас! –***
***Усім дадзім процівагазы,***
***Калі ўлады пусцяць газ!”***
***Мінск, вядома ж, падстрахуем.***
***Чым? Маім магутным***
***фронтам –***
***Ён, нібыта тая гонта,***
***Захіне і уладкуе!***
***Паглядзіце: бабка тая***
***За ідэю ўжо гарой!***
***Пераможа той, хто мае***
***Волю, веру і настрой!”***

**Севярынец скончыў. Слова**

**Папрасіў Лабковіч Вова**[49]
**( Божа ж мой, - зусім малеча!**
**У якім ты класе, а? ):**
***“Лукашэнка ўсё нявечыць,***
***Але тут не Азія!***
***І трагэдыю Айчыны***
***Трэба нам, браты, спыніць!***
***Ваяры мы і мужчыны!***
***Хопіць нам нудзіць і ныць!***
***Калі трэба, у падполле***
***Вас усіх я завяду!***
***Хай жывуць свабода, воля!”***

**Вось табе і ду-ду-ду!**
**Хоць і шыбздзік-недаростак,**
**Але ўсё не так і проста…**

**Тут з цікавым успамінам**
**Юра Новікаў**[50] **падбег:**
***“Хто хацеў, той, хлопцы, грымнуў!***
***Вось у нас быў смех дык смех:***
***Там, па “Кошкінаму дому”***[51]***,***
***Бегаў Лебедзеў***[52] ***вядомы,***
***Калі мы з’яўляліся!***
***Ой, ужо пужаліся –***
***І, што трэба, нам рабілі, --***
***Знаць, былі мы ўсё-ткі ў сіле!”***

**Як сказаць… І “вертыкальцам”**[53]
**Той, на Плошчы, грозіць пальцам,**
**І выслоўе між тых веж:**
**“Зломіш, але не сагнеш!”**[54]

**Камуніст Калякін[55], важкі,**
**Хоць папіў у Гомлі бражкі[56],**
**Але ясны розум меў:**
***“Зразумець я тут сумеў:***
***Улада справу праіграла,***
***Усё прафукалі і мы –***
***Хоць было, вядома ж, мала***
***Да сканання той зімы.***
***Не згубіць, не разгубіцца –***
***Каб наступны дзень адкрыцца***
***Перад намі змог спаўна!***
***Мэта ў нас усіх адна –***
***Каб стратэгія буяла,***
***Каб Персона паўставала,***
***Каб надзея не згасала –***
***Што ўсё добра будзе ў нас!***
***Знаю: ўжо павінен час***
***Надысці, калі ўсталюем***
***Спадарожнік для ТБ –***
***І тады ўжо намалюем!***
***І ніхто не абскубе***
***З дрэва нашага лісты, -***
***Знікне цемра нематы,***
***Хоць і хоча звесці нас***
***Найглаўнейшы прэзідэнт!***
***Бачу: вось ён, светлы час!***
***Веру: будзе прэцэдэнт!”***

**Во якія камуністы**
**Ў нашых шэрагах, браток!**
**Як раней: усё празрыста,**
**У памкненнях – ясна, чыста,**
**Словы – мудрасці глыток…**

**Тут узняўся самы першы**
**Наш плейбой і прыгажун –**
**Дабравольскі[57]. Словы-вершы**
**Паліліся – жу-жу-жу:**
***“Хоць і будуць нас пытацца***
***І выкручваць нам яйцы –***
***Мы не скажам: хто, калі,***
***І ў які мы бок пайшлі.***
***Бо заб’юць і закапаюць –***
***То ж дзяржаўны тэрарызм!***
***Успамінаў нам хапае***
***І хапае ўладных клізм.***
***Не ў сталіцы зробім справу –***
***Хай правінцыя дае,***
***Хай магутна паўстае***
***Хваля злева,***
***хваля справа!***
***На майданах хай мандаты***
***Уручае сам народ!***
***Як убачыць: не манда ты –***
***Усё падпіша.***
***І - ў паход!***
***Мы, вядома, услед пакрочым,***
***Усё падлічым і адсочым –***
***Будуць месцы: раз, два, тры.***
***І тады ўжо дагары***
***Перавернем рэчаіснасць –***
***І зацвердзім***
***нашу***
***існасць!***
***Перамога! Ну, а потым***
***Зробім важную работу –***
***Абразанне!***
***То не смех:***

***Паўнамоцтвы ўзяць не грэх!***
***Вунь парлямэнт размахнецца,***
***І свайго захоча ўрад, -***
***Там такія будуць перцы,***
***Што хавай, браточак, зад!***
***За работу! І – наперад!”***

**Вось такія інжынеры**
**І памкненняў, і душы!**
**Ты, браток, пішы, пішы!..”**

**Змоўк Мікола ў задуменні.**
**Вечар плыў да дальніх гмін.**
**І праз некалькі імгненняў**
**Зноў загойсаў успамін:**

**“Ну, вядома ж, падлічылі**
**“За” і “супраць” галасы.**
**Ледзь са сракі не злупілі**
**Арцішэўскаму трусы –**
**Ён хацеў *пасіянарнасць*[58]**
**У Праграму запісаць.**

**Закрычалі: *“Гэта марнасць!***
***І нашто нам тая гаць!..”***
**І сівога “грамадоўца”**
**Да інфаркту давялі –**
**Прычапіліся да слоўца!**
**І куды мы заплылі?..**

**Вось такая адбылася,**
**Дружа мой, дыскусія!**
**Што злілося ў гэтым часе –**
**Ведаць не бяруся я.**

**Розных поглядаў гучанне,**
**Нейкі шлях крыжовы…**
**І ў вачах расчараванне**
**У Таборкі Вовы.**

## Ш а л к е в і ч .

**Перапынак. І аб'ява:**
***"Хлопцы, стой – Шалкевіч[59] тут!***
***Хто не ведае: ён – з'ява!***
***І з Гародні свой маршрут***
***Дзеля нас сюды намеціў!***
***Зараз мы яго прывецім!***
***Дзе ты, лысы наш абрэк?"***

**І з'явіўся чалавек –**
**Можа, жыд, а мо і грэк**
**З палымянымі вачамі,**
**З адмысловымі ключамі**
**У руках – як у Пятра, -**
**Нам у рай ужо пара…**

**Страпянулася гітара,**
**Бомкнуў сіплы кантрабас,**
**І ўзляцела – пра папары,**
**Пра жыдоўскія кашмары,**
**І пра Зосін светлы час…**

**Паміж песнямі – гаворка**
**І смяшынак ліхтары, -**
**Усё Шалкевіч бачыць зорка**
**На двары,**
**чорт пабяры!..**

**І задумалася ціха**
**Наша тая талака.**

**Будуць песні –**
**знікне ліха,**
**І паглыбіцца рака**
**Лёсу нашага святога.**
**Развінецца ўсцяж дарога –**
**Дзе "Пагоня", і прасцяг,**
**Й бел-чырвона-белы сцяг.**

**Вось, урэшце, адгучала**
**Песень светлых чарада.**
**А камусь здалося мала –**
**Закрычалі: *"Барада!***
***Праспявай, як павалілі***
***Вы Яновічаў той плот!*[60]"**
**А Шалкевіч: *"Адурылі***
***Галаву! Няма тых нот!"…***

**І пабег пад пляск далоняў**
**З-пад трапечучых сцягоў[61]**
**На свае ліхія гоні,**
**Дзе ў атавах ходзяць коні –**
**Аж да самых да снягоў…**

## Недапетая песня.

**А за ім пабегла кола –**
**Хто куды.**
**Крычыць Рыгор:**
***"Будзе шчэ спяваць Мікола***

*Пра спрадвечны наш дакор!”…*

**Але тупат шматгалосы**
**Ўміг за ярам недзе сціх –**
**Толькі рэха па пракосах…**
**Ой, не будзем мы пра тых!**

**Счулі слова Кастусёва**
**І Агееў[62], і Мурзін[63],**
**І Тамара Маскалёва[64],**
**І сябрына Васількова –**
**Так што я ўжо не адзін.**

**І, заторкнуўшы касэту**
**У дрымучы апарат,**
**Я сябрам адкрыў сусветы**
**Непачутых шчэ паэтаў[65] -**
**І адразу ўзнёсся лад,**
**І усім захарашэла…**

**І бясконца б так было,**
**Але – каб яно згарэла! –**
**Нешта ў “SONY” загуло,**
**Перданула і заціхла –**
**Быццам там якое ліха**
**Ці варожы элемент.**

**Быў, аднак, апладысмент,**
**Хоць і песня недапета –**
**“Дзякуй” счуў я і за гэта.**

**І аўтографаў, дарэчы,**
**Нават пару падпісаў, --**
**Во якое мне на плечы!**

**Знакамітым, глянь ты, стаў!..**

**І руку мне доўга трэслі,**
**І значочак свой прынеслі –**
**Дзе ў блакіце лічба “пяць”.**

**Тут Рыгор на Алу – глядзь:**
***“Дзе значок? Няма? А ну-ка!*** **–**
**Свой здымае без прынукі , --**
***Будзеш дзядзьку ўспамінаць!”***

**А калі я вякнуў ціха,**
**Што наперадзе ў нас ліха**
**І ісці нам пехатой –**
**Васількоў узняўся: “*Стой!***
***На!”*** **– і выцягнуў з штаніны**
**Свой таўсценны**
**кашалёк.**

## К о д а .

**І былі мы праз гадзіну**
**У Брылях.**
**Адтуль здалёк**
**Позірк кінулі яшчэ раз**
**На вялікія памеры**
**Ў лёс зыходзячага дня…**

**Вось такая, брат, х..йня!**
**Выбачай ужо, Панасе, -**
**Растрындзеўся нешта я!**
**Будзь! Пакуль!”**

**І знік у часе,**
**Дзе у кожнага свая**
**Непаўторная дарога –**
**Да сябе,**
**людзей**
**і Бога.**

*17 лістапада 2004 г –*
*18 студзеня 2005 г.*

KAMUNIKAT.org

# Заўвагі і тлумачэнні.

[1] Рэспубліканскі Рэферэндум адбыўся 17 кастрычніка 2004 г. Каб падоўжыць свае паўнамоцтвы, А.Лукашэнка абвесціў яго правядзенне разам з выбарамі дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і вынес на разгляд наступнае пытанне: “Разрешаете ли Вы первому Президенту Республики Беларусь Лукашенко А.Г. участвовать в качестве кандидата в Президенты Республики Беларусь в выборах Президента и принимаете ли часть первую статьи 81 Конституции Республики Беларусь в следующей редакции: «Президент избирается на пять лет непосредственно народом Республики Беларусь на основе всеобщего, свободного, равного и прямого избирательного права при тайном голосовании»?

[2] Маецца на ўвазе Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, выбары ў якую адбыліся 17 кастрычніка 2004 г.

[3] Мікалай Адамавіч Яцкоў – паэт і кампазітар (не толькі мясцовага маштабу), дырэктар Брылеўскага сельскага Дома культуры Магілёўскага раёна.

[4] Рыгор Андрэевіч Кастусёў – старшыня Магілёўскай абласной Рады Партыі Беларускі Народны Фронт, кандыдат у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў па Шклоўскай выбарчай акрузе № 72. У гэтай бітве праявіў ваяцкія здольнасці і быў вельмі здзіўлены тым, што перамога трапіла ў рукі Уладзіміра Канаплёва.

[5] Вёска ў Магілёўскім раёне Магілёўскай вобласці, дзе з 1981 года працуе Мікола Яцкоў. Вядома па рукапісных крыніцах з XVI стагоддзя. У 1560 г. сяло, 45 “дымоў”, у Магілёўскай воласці, дзяржаўная ўласнасць. У 1580 г. аддадзена ў пажыццёвае валоданне памешчыку. У 1592 г. цэнтр войтаўства Магілёўскай воласці Аршанскага павета. У 1635 г. 48 двароў, меўся млын. У 1785 г. 49 двароў, 327 жыхароў, у складзе маёнтка Любуж Магілёўскага павета; уласнасць памешчыка, які меў у 1866 г. ў вёсках Брылі і Любуж 2765 дзесяцін зямлі, 2 млыны, пастаялы двор. Частка вяскоўцаў займалася сталярным промыслам. Па перапісу 1897 г. сяло (35 двароў, 201 жыхар, школа граматы, піцейны дом) і фальварак (1 двор, 11 жыхароў) у Палыкавіцкай воласці Магілёўскага павета.

У 1909 г. 43 двары, 258 жыхароў, дзейнічала школа (народнае вучылішча). У 1926 г. вёска (23 двары, 153 жыхары) і хутары (72 двары, 436 жыхароў). У 1929 г. арганізаваны калгас "Змагар". На пачатку 1930-х гадоў 4-гадовая школа ператворана ў 7-гадовую (273 вучні). У Вялікую Айчыную вайну з ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 года акупіравана нямецка-фашісцкімі захопнікамі. пасля вайны з'яўлялася цэнтрам калгаса імя Ільіча (зараз СПК "Качурына") і сельскага Савета.

[6] Уладзімір Аляксандравіч Таборка – адзін з кіраўнікоў Магілёўскага грамадскага аб'яднання "Кола сяброў" і "хросны бацька" "брылеўскага прарыву" ў Нямеччыну: паспрыяў таму, што некалькі пакаленняў нашых дзетак пабывалі "за кардонам" і шмат чаго зразумелі ў гэтым жыцці.

[7] Віталь Рыгоравіч Васількоў – кіраўнік Магілёўскага грамадскага аб'яднання "Кола сяброў", яшчэ адзін Рыгоравіч у навейшай гісторыі нашай шматпакутнай Бацькаўшчыны.

[8] Рудэя – рака, што цячэ каля вёскі Брылі.

[9] Гаворка ідзе пра канферэнцыю дэмакратычных арганізацыяў Магілёўскай вобласці "Беларусь – позірк у будучыню", якая і дала назву гэтаму апавяданню.

[10] Маецца на ўвазе, што Мікола Яцкоў з'яўляецца аўтарам і выканаўцам каля 800 песен на вершы больш чым 120 беларускіх і іншаземных паэтаў.

[11] Скарочаная назва Магілёўскага грамадскага аб'яднання "Кола сяброў".

[12] 14 лістапада 2004 г.

[13] Ала Міхайлаўна Яцкова – жонка, паплечніца, сааўтар, самы першы рэдактар і крытык усяго таго, што робіць Мікола Яцкоў.

[14] Шлях з Мсціслава на Магілёў, які пралягае праз суседнюю вёску Сухары, а таксама і каля вёскі Брылі.

[15] Вуліца Чкалава, дом № 16 – адрас у Магілёве, па якому месціцца офіс Магілёўскага грамадскага аб'яднання "Кола сяброў".

[16] Абрэвіятура назвы "Партыя "Беларускі Народны Фронт".

[17] Сакрат (Sōkrátēs, 470 (469) – 399 да н.э.), старажытнагрэчаскі філосаф. Вусна распаўсюджваў свае погляды ў Афінах, дзе меў многа вучняў і паслядоўнікаў (Платон, Антысфен, Арыстып, Эўклід з Мегар і інш.). Абвінавачаны ў тым, што ўвёў новых багоў і дрэнна ўплываў на моладзь. Пакараны смерцю (прыняў атруту). Паводле Сакрата, задача філасофіі не пазнанне прыроды і сутнасці рэчаў, а пошук адказу на пытанне, як трэба жыць: "Пазнаць самога сябе". Мудрасць – аснова высокамаральных учынкаў; чалавек, які ведае дабро, будзе дзейнічаць па-добраму, і наадварот. Веды – думка, паняцце пра агульнае. Чалавек усведамляе і ацэньвае канкрэтныя ўчынкі толькі з дапамогай нейкіх апрыёрных агульных ведаў (паняццяў). Ісціна дасягаецца праз раскрыццё супярэчнасцей ў суджэннях праціўніка. Вучэнне Сакрата з'явілася адным з тэарэтычных вытокаў аб'ектыўнага ідэалізму і ідэалістычнага метаду – "дыялектыкі" Платона.

[18] Аляксей Колчын – адзін з кіраўнікоў Магілёўскай філіі праваабарончай арганізацыі "Вясна".

[19] Сябры праваабарончай арганізацыі "Вясна", якія пайшлі цяжкім шляхам назірання на Рэферэндуме і выбарах 17 кастрычніка 2004 года.

[20] Магілёўская-Кастрычніцкая выбарчая акруга № 73 па выбарах дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, дзе балатаваліся такія вядомыя ўсім людзі, як Васіль Аўраменка (вынікі галасавання: "за" 10516, "супраць" 51177), Уладзімір Падалян ("за" 5473, "супраць" 56220), Сяргей Фамін ("за" 5567, "супраць" 56126).

[21] "Венецыянская камісія" – па чутках, сур'ёзны інстытут еўрапейскіх юрыдычных і праваабарончых структураў, прадстаўнікі якога ўважліва назіралі за ходам Рэферэндума і выбараў 17 кастрычніка 2004 года.

[22] Віталь Макаранка – адзін з кіраўнікоў магілёўскай абласной Рады партыі Беларускі Народны Фронт.

[23] Маецца на ўвазе пункт 4 праекта "Праграмы агульных дзеянняў дэмакратычных сілаў Магілёўскай вобласці на перыяд 2004-2006 г.г." "Дэлегітымізацыя рэжыму":
• распаўсюд інфармацыі аб сапраўдных выніках рэферэндуму і выбараў, у тым ліку з мэтай ціску на фальсіфікатараў (парушальнікаў закону);
• стварэнне "чорнага спісу" фальсіфікатараў, у тым ліку ў Інтэрнеце, з мэтай будучага прыцягнення іх да адказнасці. Не павінна быць учынкаў без наступстваў;
• звароты да еўрапейскіх структураў з мэтай забароны імі ўезду ў краіны Еўрапейскага Саюзу кіраўніцтву выбарчых камісій;
• стварэнне атмасферы асуджэння вакол пэўных асобаў.

[24] Васіль Аляксеевіч Аўраменка – урач 2-га неўралагічнага аддзялення Магілёўскай гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі, сябра Магілёўскага грамадскага аб'яднання "Кола сяброў", вядомы аўтар і выканаўца шчырых і шчымлівых беларускіх песен. А таксама і талковы публіцыст, чые матэрыялы лічаць за гонар друкаваць вядомыя і паважаныя беларускія выданні. Спрабаваў перамагчы ў барацьбе за дэпутацкі мандат па Магілёўскай-Кастрычніцкай выбарцай акрузе № 73, але, на жаль, не атрымалася.

[25] Генадзь Вітольдавіч Суднік – аксакал дэмакратычнага руху на Магілёўшчыне. Да 1994 года ўзначальваў Магілёўскае абласное тэлебачанне і радыё. Потым рэдагаваў магілёўскую абласную дэмакратычную газету "Тыднёвік магілёўскі", стаяў ля вытокаў стварэння грамадскага аб'яднання "Кола сяброў".

[26] Уладзімір Фядотавіч Падалян – першы сакратар Магілёўскага абласнога камітэта Партыі Камуністаў Беларускай, кандыдат у дэпутаты па Магілёўскай-Кастрычніцкай выбарчай акрузе № 73.

[27] Маецца на ўвазе тое, што У.Падаляна вымусілі пакінуць пасаду намесніка дырэктара аднаго з магілёўскіх ліцэяў, калі ён вырашыў ісці ў дэпутаты, насуперак афіцыйным "установкам".

[28] Аляксандр Маісеевіч Шчарбак – вельмі імпульсіўны і галасісты прадстаўнік шклоўскіх дэмакратычных плыняў.

[29] Маюцца на ўвазе прадстаўнікі "Пяцёркі плюс" – народнай кааліцыі, аснову якой склалі Партыя Беларускі Народны Фронт, Беларуская партыя працы, Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада, Аб'яднаная Грамадзянская партыя, Партыя Камуністаў Беларуская. Распрацавала канкрэтныя прапановы і заканапраекты, каб палепшыць эканамічную сітуацыю ў краіне, падвысіць узровень жыцця ўсіх людзей. Праграма мае назву – "Пяць крокаў да лепшага жыцця":

1. Дастойнае жыццё – кожнаму!
2. Даць людзям працаваць.
3. Улада для народа.
4. Дзяржаўныя грошы – на службу народу.
5. Павага ў свеце.

[30] Мікола Яцкоў быў старшынёю Брылеўскай участковай выбарчай камісіі па выбарах дэпутатаў і правядзенню Рэферэндума 17 кастрычніка 2004 года. Дарэчы, у выбарчых кампаніях у якасці сябра, а потым і кіраўніка участковай выбарчай камісіі Мікола Яцкоў удзельнічае з 14 студзеня 1984 года.

[31] Валерый Беразіенка – адзін з кіраўнікоў Магілёўскага абласнога камітэта Партыі камуністаў Беларускай. Прафесар, доктар тэхнічных навук – гэтыя абставіны заўсёды надаюць яго выступленням лекцыйны характар, дзе логіка і назідальнасць – галоўныя рысы.

[32] Барыс Васільевіч Батура – старшыня Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта, наш "губернатар".

[33] Абрэвіятура назвы "Камітэт дзяржаўнай бяспекі".

[34] Ігар Хоцька з Бабруйску пакінуў уражанне непрымірымага і бескампраміснага барацьбіта, што, як здаецца, не вельмі добра для чалавека, які імкнецца сказаць нешта сваё ў палітыцы.

[35] Уладзімір Алейнікаў – прафсаюзны лідэр са знакамітага саўгаса "Гарадзец" Шклоўскага раёна (адкуль у палітыку пасунуўся і А.Лукашэнка), чалавек просты і без "выпяндрожу". Здаецца,

радня вядомаму артысту савецкага кіно Пятру Алейнікаву.

36 Гаворка ідзе пра вядомую улетку “Долларовые миллионеры Беларуси” (аўтары Уладзімір Мацікевіч і Сцяпан Сухавенка), якая нелегальна шырока распаўсюджвалася на час правядзення Рэферэндуму і выбараў 17 кастрычніка 2004 г. Там надрукавана хто і колькі з беларускага кіраўніцтва накраў грошай. Зроблена па прынцыпу АБК (адна баба казала), бо няма ніякай магчымасці праверыць гэтую “фактуру”.

37 Барыс Бухель – актыўны удзельнік магілёўскіх дэмакратычных і праваабарончых плыняў. З аднаго боку, гэта не вельмі стасуецца з прыроднай асцярожнасцю дадзенай этнічнай ментальнасці. Але, з другога боку, разумееш, што ў складаныя моманты гісторыі абавязкова з’яўляецца хтось рацыянальны і мэтанакіраваны, які запальвае сэрцы і вядзе за сабой. Мы памятаем**,** ***хто*** з’явіўся галоўным “рухавіком” Кастрычніцкага перавароту ў 1917 годзе.

38 Жаргоннае слова ад ***“green” – зялёны*** (колер *долара* – грашовай адзінкі Злучаных Штатаў Амерыкі).

39 Алесь Чыгір – хоць і малады, але ўжо шмат чаго зрабіў карыснага ў дэмакратычным жыцці Бабруйска. Прозвішча абавязвае яго не толькі ўладкоўваць сваю асабістую пасеку, але і пра народ думаць.

40 Сяргей Аляксандравіч Фамін – актыўны ўдзельнік незалежнага прафсаюзнага руху на Магілёўшчыне. Быў кандыдатам у дэпутаты па Магілёўскай-Кастрычніцкай выбарчай акрузе № 73. Вельмі спадзяваўся на дапамогу сваёй барадата-прасцецкай знешнасці і ўменню весці “каліграфічныя” размовы аб усім і ні аб чым. Але…

41 Аляксандр Мілінкевіч – кіраўнік гарадзенскага грамадскага аб’яднання “Ратуша” (накшталт нашага “Кола сяброў”), адзін з кіраўнікоў руху “Рэгіянальная Беларусь”.

42 “Крэсы Ўсходне” (ад польскага ***kres*** - вобласць. мяжа. кардон), назва, якую ўжывалі афіцыйныя польскія ўлады ў дачыненні да Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, калі яны ўваходзілі ў склад Польшчы (1921 – 1939 г.г.).

[43] Валерый Арцішэўскі – прадстаўнік з Мінску ад партыі Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада. Негледзячы на сталы ўзрост і сівыя валасы, па-юнацку захоплены калізіямі палітычнай барацьбы.

[44] Партыя Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада. Кіраўнік – Станіслаў Станіслвіч Шушкевіч. Паводле ідэялогіі бліжэйшая да Беларускага Народнага Фронту. Сацыялагічныя апытанні паказваюць досыць высокі ў параўнанні з іншымі партыямі рэйтынг БСДГ – да 6%; гэта можна патлумачыць вядомасцю і аўтарытэтам С.Шушкевіча.

[45] Сумнавядомы горад у Паўночнай Асеціі (Расія), дзе 1 верасня 2004 года тэрарыстамі былі захоплены ў заложнікі больш за 1000 вучняў і настаўнікаў школы № 1, амаль палова з якіх загінулі.

[46] Аляксей Янукевіч – адзін з кіраўнікоў партыі Беларускі Народны Фронт. Малады, хваткі, па-еўрапейску прагматычны. Можа, з гэтай нагоды ягоная беларускасць мае размытыя і не вельмі акрэсленыя рысы.

[47] Віктар Юшчанка – кандыдат у Прэзыдэнты Украіны на выбарах 2004 года, лідэр так званай "аранжавай рэвалюцыі".

[48] Павел Севярынец – старшыня "Маладога Фронту" (з 1999 г.) – маладзёвага крыла Беларускага Народнага Фронту. Намеснік старшыні БНФ. У 1998 г. правёў два месяцы ў турэмным зняволенні пасля буйной акцыі пратэсту, наладжанай беларускай апазіцыяй. Здольны прымаць камандзірскія рашэнні. Адчуваецца, што ягоным крылам цесна ў сёняшняй апазіцыйнай прасторы.

[49] Уладзімір Лабковіч – адзін з лідэраў Беларускага Народнага Фронта. Мае здзіўляюча малады ўзрост, але калі паслухаць ягоныя палымяныя прамовы, то з'яўляецца неадольнае жаданне звяртацца да яго не "Уладзімір", а "Валадар".

[50] Юрый Новікаў – старшыня Магілёўскай абласной арганізацыі Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады. Здаецца, упэўнены

ў тым, што да ўсіх трэба ставіцца па прынцыпу: “Калі не паважаюць, то няхай баяцца!”

[51] Мясцовая магілёўская тапанімічна-фальклорная мянушка будынка Адміністрацыі Кастрычніцкага раёна г.Магілёва, дзе раней месціўся Цэнтральны раённы камітэт Камуністычнай партыі Беларусі г.Магілёва, першым сакратаром якога была Тамара Рыгораўна Кот.

[52] Яўген Аляксандравіч Лебедзеў – кіраўнік Адміністрацыі Кастрычніцкага раёна г.Магілёва. Дзядзька даволі сур’ёзны, і не вельмі зразумела, чаму ён бегаў “на цырлах” перад прадстаўнікамі апазіцыі, - можа, з вялікай павагі да гэтых мужных людзей, а, магчыма, адчуў, што палітычнае надвор’е можа і памяняцца.

[53] Аўтарскае абазначэнне прадстаўнікоў уладнай “вертыкалі”.

[54] Гаворка ідзе пра сонечны гадзіннік у выглядзе скульптурнай кампазіцыі на Плошчы Зорак (каля кінатэатра “Радзіма”) у г.Магілёве. І няхай адліты там у бронзе дэвіз Магілёва (“Зломіш, але не сагнеш!”) гістарычна не вельмі дакладны, - гэтыя словы ўжо не дадуць Магілёву і магілёўцам спыніць сваю рашучую хаду ў бок еўрапейскіх каштоўнасцяў, якая пачалася аж у 1577 годзе – з наданнем гораду Магдэбургскага права.

[55] Сяргей Калякін – першы сакратар Цэнтральнага Камітэта Партыі камуністаў Беларускай. Разумны, лагічны, але больш нагадвае немца, чым рэвалюцыянера з палымянымі вачамі, за якім, забыўшы пра ўсё, пойдуць людзі.

[56] Маецца на ўвазе тое, што перад Магілёвам С.Калякін у складзе дэлегацыі быў на падобнай канферэнцыі ў Гомеле.

[57] Аляксандр Дабравольскі – намеснік старшыні Нацыянальнага камітэту Аб’яднанай Грамадзянскай Партыі. Быў дэпутатам не толькі Вярхоўнага Савета Рэспублікі беларусь 13-га склікання, але яшчэ раней нават уваходзіў у склад Вярхоўнага Савета СССР (у 1989-1991 г.г.). Сапраўдны палітычны зубр (ці мамант?). Па знешнему выгляду і сібарыцкіх манерах не скажаш, што ён дзеля ідэі здолее перабрацца на нейкі час у шалаш – як у свой час гэта

зрабіў вядомы У.Ульянаў (Ленін).

[58] Пасіянарнасць (ад грэчаскага ***passio*** – *пачуццё, пакута*), неадольная цяга людзей да ажыццяўлення сваіх ідэалаў. З'ява пасіянарнасці ўведзена Л.М.Гумілёвым. Паводле Гумілёва, пасіянарнасць ляжыць у аснове ўсякіх дзеянняў, якія пакідаюць след у гісторыі. Яна фарміруецца ў выніку моцных усплёскаў біяхімічнай энергіі космасу і канцэнтруецца ў параўнальна невялікіх абласцях зямной паверхні. На падставе гэтай ідэі Гумілёў стварыў пасіянарную тэорыю этнагенезу, у цэнтры якой уяўленне пра этнас, як біясферны, несацыяльны феномен чалавечых паводзін. Пасіянарныя "штуршкі" нараджаюць павышаную сацыяльную актыўнасць, якая ў пэўных гісторыка-геаграфічных умовах садзейнічае ўтварэнню новых этнасаў і этнічных сістэм (суперэтнасаў). Энергія пасіянарнасці забяспечвае стварэнне і існаванне ў біясферы Зямлі усёй разнастайнасці этнічных сістэм – прыродных калектываў людзей з агульнымі стэрэатыпамі паводзін, на якія накладвае адбітак геаграфічнае асяроддзе, культурная традыцыя і этнічнае акружэнне.

[59] Віктар Шалкевіч – вядомы на Беларусі і далёка за яе межамі гарадзенскі паэт і спявак. Мае вострае вока і аглушальнае пачуццё гумару. Калі прыглядзецца да яго ўважліва, то за знешняй адчыненасцю можна ўбачыць вялікі сум і пэўную адзіноту.

[60] Маецца на ўвазе песня Віктара Шалкевіча "Гарадоцкі раманс", навеяная знаёмствам у Крынках (Польшча) з Сакратам Яновічам - пісьменнікам, самым вядомым беларусам на Беласточчыне. Пасля знаёмства з гэтым творам С.Яновіч яшчэ доўга бурчэў, што Шалкевіч абы што наплёў пра ягоны вельмі дабротны плот.

***"Гарадоцкі раманс"***

**Калі на захадзе заблiскаюць зарнiцы,**
**I сон паморыць і жывёлу, і людзей,**
**Прыходзь тады, мая Марыська, да крыніцы,**
**Як мае быць, нам заспявае салавей.**

**Закрэхчуць жабы гэтак млосна у балоце,**
**Як быццам заўтра не крахтаць ім і не жыць.**

**І пры паваленым Яновічавым плоце**
**Мы станем ціхенька і будзем гаварыць.**

**Быў я ў Гайнаўцы ў мінулым панядзелку.**
**Вазілі з бацькам на продаж воз гаршкоў,**
**І даў стары мне трохі грошай на гарэлку,**
**А я замест карчмы у краму – шасць цішком.**

**Забег у надта у пажондную я краму,**
**Дзе мае гэшэфт сам пан Валовіц Абрам.**
**І, сталкаваўшыся з Валовіцам Абрамам,**
**Купіў пярсцёнак. Прыдзеш, то табе аддам.**

**Во, певень заспяваў. За ім другі і трэці.**
**На лямпы фукнуў працай здушаны народ.**
**Цябе ж, Марыся, пэўна дзецьці носяць чэрці.**
**Хай лепш прынеслі б пад Яновічавы плот.**

**Пара ісці, напэўна трэцяя гадзіна,**
**Бо месяц ссунуўся за Крынкаўскі бальшак.**
**І з плота я цягну здаровую тыніну**
**Каб мне было чым адбівацца ад сабак.**

[61] Віктар Шалкевіч спяваў свае песні на фоне прымацаваных да сцяны памяшкання сцягоў дэмакратычных арганізацыяў і партый, прадстаўнікі якіх удзельнічалі ў канферэнцыі.

[62] Аляксандр Рыгоравіч (!) Агееў – навуковец-гісторык, дацэнт, дэпутат Магілёўскага гарадскога Савета (ці не адзіны там прадстаўнік мясцовых дэмакратычных плыняў).

[63] Сяргей Мурзін – прадпрымальнік з г.п.Дрыбін і актывіст тамашняга местачковага дэмакратычнага жыцця. Добра, што ў такіх мядведжых кутах заварушылася нешта новае, маладое і моцнае.

[64] Тамара Міхайлаўна Маскалёва – актывістка магілёўскага дэмакратычнага руху. Негледзячы на паважаны ўзрост, сапраўдная піянерка – у першапачатковым значэнні гэтага слова: французскае

***pionnier – першапраходзец, пачынальнік, той,хто пракладвае новыя шляхі ў якой-небудзь вобласці дзейнасці.***

[65] У выкананні Міколы Яцкова прагучалі песні на вершы беларускіх паэтаў Генадзя Бураўкіна, Сяргея Законнікава і Эдуарда Акуліна.

KAMUNIKAT.org